**Пасля поспеху леташняга мерапрыемства «Адкрытыя сэрцы, вольныя словы» запрашаем на другую адслону гэтага мастацка-літаратурнага праекта — гэтым разам пад назвай «Хваля. Слова. Святло.»**

«Хваля. Слова. Святло.» — гэта гісторыі пра моманты бяссілля і аднаўлення сілы, пра каханне, ідэнтычнасць і пошук уласнага шляху. Пра цёплыя гісторыі, што пахнуць кавай і шакаладам, пра прамяні святла і надзеі, якія рассейваюць змрок халодных дзён.

Падчас мерапрыемства прагучаць вершы і ўрыўкі прозы на украінскай, польскай і беларускай мовах. **Запрашаем у Willa Sixta у суботу, 15 лістапада 2025 года а 15:30.**

Гэтым разам літаратурную сустрэчу дапаўняе прэзентацыя творчасці ўкраінскай мастачкі Аксаны Дучэнчук. Яе чорна-белыя працы, пабудаваныя на кантрасце і лініі, ствараць візуальны дыялог з чытанымі тэкстамі. Падчас вечара таксама адбудзецца мастацкі перформанс — стварэнне выявы на вачах у публікі.

Вечар будзе весці Юлія Агіньская.

Да ўдзелу запрашаюцца ўсе — і тыя, хто хоча паслухаць польскую, украінскую і беларускую паэзію або прозу, і тыя, хто жадае падзяліцца абраным творам (польскага, украінскага або беларускага аўтара ці ўласным тэкстам).

**Умовы ўдзелу для тых, хто хоча прачытаць твор або яго ўрыўк:**

- Дашліце заяўку на e-mail: j.oginska@galeriabielska.pl, указаўшы сваё імя, прозвішча, аўтара і назву твора, які хочаце прадставіць.
- Працягласць выступлення — **да 10 хвілін.**
- Мерапрыемства адкрытае для ўсіх, незалежна ад паходжання ці ідэнтычнасці. Мы ствараем прастору павагі, эмпатыі і ўзаемнага прыняцця.
- Заяўкі прымаюцца **да 9 лістапада 2025 года.**

Мерапрыемства адбываецца ў межах праграмы **Святліцы імя Кацярыны Білокур** — прасторы інтэграцыі і мастацкіх сустрэч людзей з вопытам міграцыі, якая дзейнічае пры **Галерэі Бельскай BWA.**

**Аксана Дучэнчук** — украінская мастачка і ілюстратарка, якая працуе ў тэхніцы акварэлі і графікі. Нарадзілася ў Цярнопалі. Вучылася ў мастацкай школе імя Міхайлы Бойчука, скончыла Цярнопальскі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт.

Больш за дзесяць гадоў працавала дызайнеркай інтэр'ераў. З 2016 года займаецца ілюстрацыяй дзіцячых кніг, а таксама выкладае акадэмічны рысунак у IT STEP Academy.

Удзельніца шматлікіх нацыянальных і міжнародных выстаў — у Кіеве, Львове, Адэсе, Чарнаўцах, Польшчы, Францыі, Германіі і В'етнаме.

Аўтарка персанальных выстаў у Львове, Цярнопалі і Роўне. Членка мастацкіх аб'яднанняў IWS Ukraine і Bucovinian Watercolor Association.

У сваёй творчасці спалучае лірызм акварэлі з сучаснай эстэтыкай і тонкай увагай да ўнутранага свету чалавека.